РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛЮТАГА 2025 г. ЧАЦВЕР № 30 (30418)

# СКЛАДНІКІ ПАСПЯХОВАСЦІ — ЭКСПАРТ І ІНВЕСТЫЦЫІ

Пра гэта не стамляецца паўтараць кіраўнік дзяржавы, гэта формула выжывання не толькі для эканомікі краіны, але і для яе суверэнітэту. Мы вырабляем прадукцыі нашмат больш, чым можам спажыць на ўнутраным рынку, значыць, трэба зрабіць яе такой, каб яе купілі на знешніх. Мы хочам прыцягнуць у сваю эканоміку замежныя інвестыцыі — значыць, трэба стварыць інвестару такія ўмовы, каб ён прынёс свае грошы менавіта да нас. Аб'яўленая Прэзідэнтам пяцігодка якасці — якраз пра гэта, стымул для дзеяння. Ад навядзення парадку паўсюль да стварэння новых плошчаў у індустрыяльных парках, каб да нас хацелі ехаць. Ад мадэрнізацыі вытворчасцяў да вырабу запатрабаванай прадукцыі, каб яе хацелі купіць.
Аб гэтым гаварылі ўчора ў абедзвюх палатах парламента. Тэмы і фармат мерапрыемстваў — розныя, але мэта адна — зрабіць Беларусь і беларускае яшчэ больш прывабным.



СТАР. 4–5




ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЕ МСЦІСЛАЎ

9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ДОБРАЯ НАВІНА

## НАДБАЎКІ МЕДСЁСТРАМ І ФЕЛЬЧАРАМ ВЫРАСТУЦЬ НА 35 ПРАЦЭНТАЎ

**Працягваецца работа па павелічэнні зарплат медыкам**

Зарплата медыцынскіх работнікаў з сярэдняй адукацыяй будзе павышацца на працягу бягучага года дзякуючы павелічэнню надбавак. Учора апублікавана пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь № 18, якая вызначае надбаўкі сярэдняму медыцынскаму персаналу.



СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X
25030>




# СІЛА, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ І ЗГУРТОЎВАЕ ЎСІХ

## Дэлегаты УНС — пра тое, як паўплываў на палітычнае жыццё краіны папярэдні сход і чаго яны чакаюць ад наступнага

Пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу — другое па ліку ў яго новым канстытуцыйным статусе — пройдзе ў красавіку. Аб гэтым паведаміў Старшыня УНС, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на Прэзідыуме УНС. Фактычна быў дадзены старт падрыхтоўцы гэтага важнага форуму, падчас якога дэлегаты, якія цяпер выбіраюцца на пяць гадоў, вызначаюць асноўныя кірункі, па якіх будзе рухацца краіна.

УНС у новым статусе — гэта адзін з найважнейшых паказчыкаў рэформы нацыянальнай палітычнай сістэмы. Яго рашэнні, прапановы, якія гучалі падчас першага пасяджэння ў красавіку мінулага года, таксама паўплывалі на выбудоўванне новай дзяржаўнай архітэктуры. Карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся ўласна ў дэлегатаў УНС, што ў палітычнай архітэктуры краіны змянілася з красавіка мінулага года і якія іх чаканні ад новага пасяджэння.



**Генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя», член Савета Рэспублікі Людміла САПЕГА:**

«Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, пасяджэнне УНС, якое мае адбыцца ў красавіку, другі раз пройдзе ў новай для дэлегатаў якасці. У адпаведнасці з прынятымі навеламі ў Канстытуцыі краіны, УНС не дубліруе, а дапаўняе іншыя галіны ўлады, прымаючы рашэнні глабальнага характару. На папярэднім пасяджэнні дэлегаты прынялі асноўныя для бяспекі дзяржавы дакументы — Ваенную дактрыну і Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, вызначылі асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на найбліжэйшую пяцігодку.

Гэтым разам УНС як кантралявальны орган у тым ліку ўпершыню заслухае даклад прэм'ер-міністра краіны па выніках работы за пяць гадоў і перспектывах на будучыню. Акрамя таго, дэлегатам трэба будзе прыняць шэраг асноўных кадравых рашэнняў, што стане чарговым крокам у прыцягненні шырокіх народных мас да ўдзелу ў дзяржаўным будаўніцтве. Бо дэлегаты прадстаўляюць не толькі ўсе рэгіёны Беларусі, але і ўсе сацыяльныя, рэлігійныя і ўзроставыя пласты грамадства.

Аднак найбольшая ўвага не толькі дэлегатаў УНС, але і ўсіх беларусаў будзе прыкавана да маючага адбыцца Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту, якое, напэўна, стане праграмным дакументам для далейшага развіцця і ўмацавання нашай краіны. Асноўныя ўмовы для вырашэння задач, якія стаяць перад беларускім народам у ходзе рэалізацыі пяцігодкі якасці, Аляксандр Лукашэнка ўжо агучыў на нядаўнім пасяджэнні Прэзідыума УНС — пачынаць трэба з аптымізацыі кіраўніцкіх працэсаў, татальнай дэбюракратызацыі і жалезнай выканальніцкай дысцыпліны».



**Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі «Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа», член Савета Рэспублікі Ала СМАЛЯК:**

«Наданне Усебеларускаму народнаму сходу канстытуцыйнага статусу стала важным крокам удасканалення сістэмы дзяржаўнага кіравання, узмацнення народаўладдзя.

Народнае веча надзелена найсур'ёзнейшымі паўнамоцтвамі. І, вядома, найсур'ёзнейшая адказнасць ускладаецца на дэлегатаў УНС. Гэта адказнасць у цэлым за будучыню краіны, за яе росквіт, упэўнены рух наперад.

Пры гэтым дэлегаты — а гэта прадстаўнікі самых розных сфер — не толькі вызначаюць ключавыя арыенціры ўнутранай і знешняй палітыкі, сацыяльна-эканамічнага развіцця і гэтак далей, але і тлумачаць, даносяць сутнасць найважнейшых праграмных дакументаў, прынятых рашэнняў людзям на месцах. Адначасова ў дыялогу з грамадзянамі збіраюць і акумулююць інтарэсы, пытанні, тэмы, якія павінны быць у фокусе дзяржаўнай палітыкі.

Несумненна, УНС у яго новым канстытуцыйным статусе ўсё больш і больш набірае сілу, якая аб'ядноўвае і згуртоўвае ўсіх грамадзян нашай краіны ў вырашэнні задач развіцця беларускай дзяржаўнасці, умацавання стабільнасці ў грамадстве, захавання міру, бяспекі, згоды на нашай зямлі. У цэлым канстытуцыйныя навацыі, якія датычацца пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам, парламентам, урадам, мясцовымі органамі кіравання і самакіравання, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці ўсіх галін улады».



**Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Кацярына ЗЕНКЕВІЧ:**

«У красавіку 2024 года ў Рэспубліцы Беларусь упершыню ў канстытуцыйным статусе адбылося пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу. Яго Старшынёй быў выбраны Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, які, згодна з Канстытуцыяй, звярнуўся са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і парламента. У сваім Пасланні кіраўнік дзяржавы адзначыў, што для захавання суверэнітэту, незалежнасці, міру на беларускай зямлі мы павінны быць моцнымі. І мы ідзём менавіта гэтым курсам. Даказваем усім, што наша сіла — гэта традыцыі, сапраўдныя каштоўнасці, гістарычная спадчына. У вышэйшым органе народаўладдзя прадстаўлены ўсе пласты нашага грамадства, і самыя розныя катэгорыі грамадзян уключаны ў найважнейшыя працэсы ў жыцці краіны. Гэта і ёсць сведчанне сапраўднай народнай дэмакратыі. Быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу — значыць рабіць свой унёсак у развіццё краіны, узяць на сябе адказнасць за яе будучыню, бо менавіта на народным вечы ў красавіку гэтага года будуць вызначаны новыя стратэгічныя кірункі развіцця нашага грамадства і дзяржавы».



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Ірына ДАЎГАЛА:**

«Усебеларускі народны сход стаў неад'емнай часткай палітычнай сістэмы Беларусі. Трэба заўважыць, што сёлета сваю работу працягвае VII Усебеларускі народны сход, першае пасяджэнне якога прайшло ў красавіку 2024 года. Гэта значыць, на другое пасяджэнне прыедуць дэлегаты, якія былі выбраны летась, яно адбудзецца ў тым жа складзе.

Мы ўжо год жывём па Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыне, якую прымалі дэлегаты УНС. Гэта найважнейшыя дакументы, якія накіраваны, у першую чаргу, на захаванне міру і суверэнітэту Беларусі. Пры гэтым цалкам дакладна не за кошт іншых краін і не на шкоду іншым дзяржавам, але выключна за кошт міралюбівай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Гэтыя дакументы, як і наша Канстытуцыя,




**Даслоўна**

## Яркая падзея стратэгічнага характару



У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** выказаў меркаванне, чаго чакаць ад чарговага пасяджэння УНС.

Эксперт нагадаў, што, згодна з Канстытуцыяй, УНС з'яўляецца стратэгічным органам, які вызначае асноўныя кірункі знешняй і ўнутранай палітыкі:

— Прэзідэнцкімі выбарамі мы, зыходзячы са змяненняў, унесеных у Канстытуцыю, завяршылі фарміраванне нашай новай палітычнай сістэмы. На УНС у красавіку будзе заслухоўвацца справаздача прэм'ер-міністра. Ён павінен будзе агучыць тыя вынікі, якіх дасягнуў урад за мінулы год. Год, з аднаго боку, быў няпросты, а з другога — досыць стабільным.

Таксама, па словах Аляксея Бяляева, можна будзе ацаніць, як працуюць органы ўлады ў новай канфігурацыі палітычнай сістэмы:

— Безумоўна, узнікае пытанне пастаноўкі задач на новую пяцігодку. Мы павінны кантраляваць і зменлівыя ўмовы вакол нас, і прыход Трампа да ўлады ў ЗША, і іншыя пытанні. Гэта ўсё не можа не быць адлюстравана ў выступленні Аляксандра Лукашэнкі на УНС. Акрамя таго, Усебеларускі народны сход павінен ператварыцца ў рабочы орган. Павінен быць адпрацаваны і механізм дзейнасці яго прэзідыума. Магчыма, раней у перадвыбарны перыяд на гэта не звярталі ўвагі. Цяпер жа гэтыя механізм трэба наладжваць. Увогуле, чакаецца сур'ёзная работа. УНС — гэта буйная і яркая падзея стратэгічнага характару.

маюць толькі абарончы характар.

Новае пасяджэнне, якое ўжо анансаваў Старшыня УНС, будзе мець насычаны парадак дня і вялікае значэнне для жыцця беларусаў. Гэта і кадравыя пытанні ў сувязі са зменай урада пасля прэзідэнцкіх выбараў, і пытанні падрыхтоўкі новай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, і шэраг іншых.

У дэлегатаў УНС маюцца паўнамоцтвы, якія дакладна акрэслены ў Законе «Аб Усебеларускім народным сходзе», і гэтымі паўнамоцтвамі яны карыстаюцца. Размова пра тое, што дэлегаты УНС могуць выступаць і з канстытуцыйнымі, і з заканадаўчымі ініцыятывамі, уносіць прапановы па дзяржаўных святах... Але самае галоўнае паўнамоцтва — зацвярджэнне ўнутранай і знешняй палітыкі краіны».



**Генеральны дырэктар агенцтва «Мінскнавіны», дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй КРЫВАШЭЙ:**

— Прэзідэнт нашай краіны паслядоўна выконвае рашэнне аб перадачы часткі паўнамоцтваў ураду, губернатарам. Якраз днямі кіраўніком дзяржавы абмяркоўваліся пытанні паўнамоцтваў вертыкалі ўлады, работы старшыняў раённых і гарадскіх выканкамаў. Акрамя таго, я думаю, што новыя паўнамоцтвы і адказнасць будзе ўскладзена на старшыняў базавых Саветаў дэпутатаў. Без іх не зацвярджаюцца ніякія бюджэты, не вырашаюцца многія пытанні. Яны якраз і выступаюць, у добрым сэнсе гэтага слова, лабістамі развіцця сваіх рэгіёнаў.

Дэлегаты УНС — унікальныя людзі з важным жыццёвым вопытам і актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Я думаю, што на наступным Усебеларускім народным сходзе будуць рэальна пазначаны стратэгічныя і тактычныя мэты. Будуць падняты і тыя жыццёвыя сітуацыі, з якімі сутыкаюцца нашы грамадзяне і якія мы, як дэпутаты, збіраем у сваіх акругах. Напрыклад, праблема чыстай вады доўгія гады заставалася ва ўсіх на слыху. Якраз-такі праз Прэзідэнта, праз нашых дэпутатаў і звярталіся мінчане. Пасля пераводу сталіцы на забеспячэнне вадой з падземных крыніц мы атрымалі каласальны, як гэта можна сёння казаць, фідбэк ад насельніцтва. Гэта тое, што не змагла рэалізаваць савецкая ўлада, але змагла рэалізаваць наша пры актыўнай падтрымцы дэпутацкага корпуса сталіцы. Калі мы бачым, чуем і адчуваем такія запыты ад нашых грамадзян, тады і з'яўляецца магчымасць вынесці іх на разгляд на УНС, вырашыць іх на самым высокім узроўні. Гэта робіцца для таго, каб наша краіна станавілася лепшай з кожным днём.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ШЛЯХ ЛІДАРА

## Як стваралася кніга «Наш Прэзідэнт»

Эксклюзіўныя падрабязнасці раскрылі ўдзельнікі аўтарскага калектыву падчас прэзентацыі для супрацоўнікаў Дзяржсакратарыята Савета бяспекі, Адміністрацыі Прэзідэнта і Кіраўніцтва справаў Прэзідэнта, паведаміла БелТА. Яны расказалі пра тое, як стваралася выданне ад нараджэння ідэі да яе ўвасаблення, а таксама падзяліліся эмоцыямі і падрабязнасцямі творчага працэсу.




Фота БелТА.

«Мы на пачатковых этапах кнігу ўяўлялі зусім іншай. Зараз глядзіш — з цяперашнім выданнем яна не мае нічога агульнага. Ні па падыходах, ні па фармаце, ні па ілюстрацыях», — заўважыў на сустрэчы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** Паводле яго слоў, якія пацвердзілі і іншыя аўтары, работа выдалася вельмі складаная, карпатлівай і, вядома, адказнай. А працягнулася яна каля трох гадоў.

Вывучаўся і досвед падобных друкаваных прац аб лідарах іншых краін. Недзе гэта творы, напісаныя прафесійнымі біёграфамі, недзе — публіцыстыка, фотаальбомы і нават набор цытат з розных сродкаў масавай інфармацыі. «Ніводны з фарматаў не падыходзіў для таго, каб зрабіць нарыс (біяграфічны, гістарычны) аб нашым Прэзідэнце, аб нашай краіне, створанай яго рукамі. Гэта ўсё не падыходзіла, каб у поўнай меры распавесці аб ролі асобы, аб ролі і месцы нашага Прэзідэнта, аб тым, як ён фарміраваўся і потым фарміраваў тую краіну, у якой мы з вамі жывём і працуем», — растлумачыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Аляксандру Лукашэнку макет выдання быў прадстаўлены ў жніўні мінулага года. І кіраўнік дзяржавы паставіў задачу яшчэ раз перагледзець кнігу разам з прадстаўнікамі розных сфер, з экспертамі. «Каб кніга, якая датычыцца дзейнасці Прэзідэнта, яго біяграфіі, была разгледжана на самым высокім крытычным, экспертным узроўні», — удакладніў Уладзімір Пярцоў. У выніку былі ўнесены пэўныя карэкціроўкі, дабаўлены некаторыя фотаздымкі, зменены і тэкставая, і змястоўная часткі. Кніга, на яго думку, атрымалася годная, цікавая як для прадстаўнікоў старэйшага пакалення, так і для моладзі, што пацвярджаецца ажыятажным попытам на яе.

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ** расказала, што ўвесь перыяд работы над кнігай суправаджаўся рознымі эмоцыямі, час быў складаны, даводзілася працаваць з вялікім масівам інфармацыі і з пачуццём вялікай адказнасці. А перад выхадам выдання ў свет былі асаблівыя апасенні. «Я вельмі шмат на момант падрыхтоўкі і асабліва на фінальным этапе думала і апасалася не апраўдаць завышаных чаканняў. Гэта было самым страшным. Таму на першай прэзентацыі ў Нацыянальнай бібліятэцы я вельмі выразна старалася да прысутных, да грамадскасці данесці тэзісы аб тым, што мы не ставілі задачы зрабіць нешта залішне яркае, кідкае (у сучасных павевах), тым больш нешта жоўтае, раскрыць падрабязнасці таго, што адбываецца ў палітычных кулуарах... Напэўна, некалі трэба будзе і гэта зрабіць, але не цяпер», — сказала яна.

«Нашай галоўнай задачай было адлюстраваць той вялікі шлях, які прайшоў ужо і па якім ідзе наш Прэзідэнт», — падкрэсліла Наталля Эйсмант. Асабліва важным, паводле яе слоў, было выклікаць у чытачоў пачуццё датычнасці да падзей, якія згадваюцца ў кнізе, і ў канчатковым выніку — да лёсу ўсёй краіны. «Спадзяюся, што для ўсіх нас гэта яшчэ адна нагода ганарыцца тым, што мы з вамі датычныя да рашэнняў, здзяйсненняў, да шляху, які праходзіць першы Прэзідэнт нашай краіны і наша суверэнная Беларусь», — адзначыла яна. Прэс-сакратар падзякавала ўсім, хто дапамагаў аўтарскаму калектыву ў рабоце над кнігай: «Вялікая работа праведзена вялікай камандай».

Аўтары не хаваюць, што чакалі цікавасць да кнігі, але тое, што адбылося, перасягнула іх чаканні. Звычайна кнігі ў Беларусі выдаюцца тыражом каля тысячы экзэмпляраў, у рознага роду навучальных дапаможнікаў ён можа быць у некалькі разоў большы. Улічваючы ўсё гэта, кнігу «Наш Прэзідэнт» выдалі з запасам — першапачатковы тыраж быў вызначаны ў 5 тысяч экзэмпляраў, і ён практычна распрададзены.

Паколькі попыт аказаўся такім значным, прынята рашэнне накіраваць кнігу для продажу ў абласныя цэнтры, дзе вызначана па адной краме ААТ «Белкніга», у якую паступіла гэтае выданне. Людзі загадзя запісваюцца ў чаргу на яго набыццё. Паступаюць заяўкі на калектыўны і індывідуальны закуп, у тым ліку з-за мяжы. У сувязі з чым прынята рашэнне дадаткова выдаць яшчэ 10 тысяч экзэмпляраў. Абмяркоўваюцца планы па перакладзе і выданні кнігі на англійскай мове.

Вельмі паказальную гісторыю пра непадробную, шчырую цікавасць публікі да кнігі «Наш Прэзідэнт» распавёў падчас прэзентацыі **доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ.** «Мы першапачаткова разумелі, што кніга выкліча шырокую цікавасць, прычым ва ўсіх чытачоў: і вучоных, і адміністрацыйных работнікаў, і настаўнікаў, і моладзі, і ветэранаў. Гэта было чакана, — заўважыў Аляксандр Радзькоў. — Але калі кніга выходзіць у свет, заўсёды ёсць нечаканыя назіранні, адзнакі. Мы бачылі, што тыраж разыходзіўся літаральна з колаў, людзі вельмі хацелі купіць, і не ўсім хапала, таму запісваліся ў чаргу. У краме «Светач», як расказвалі прадаўцы, дзяўчынка-школьніца вельмі прасіла: «Дайце мне кнігу без запісу! У майго таты дзень нараджэння, і я хачу зрабіць яму такі падарунак». Вось такія шчырыя, кранальныя рэчы сведчаць аб тым, што сапраўды ўсім беларусам (і не толькі) гэтая кніга цікавая».

## Задача ад Першага

***«Асноўная мэта гэтай праграмы — стварэнне і развіццё інфраструктуры краіны: інжынернай, сацыяльнай, вытворчай і абароннай. Пры гэтым накіраванасць праграмы, размеркаванне яе сродкаў паміж абазначанымі сферамі павінны строга адпавядаць рэаліям часу. Ніводнай капейкі нельга траціць на тое, без чаго мы можам абысціся. Ключавы прынцып, якім трэба кіравацца: эканомія, эканомія, эканомія.»***

*Аляксандр Лукашэнка падчас даклада аб зацвярджэнні Дзяржаўнай інвестпраграмы на 2025 год. 15 студзеня 2025 года*

### Руплівыя гаспадары заўжды знойдуць сродкі, каб інвеставаць у будучыню

Дзяржаўная інвестпраграма пасля дапрацоўкі была зацверджана адпаведным указам кіраўніка дзяржавы 5 лютага. У ёй вытрыманы ўсе патрабаванні Прэзідэнта: і аб эканоміі, і аб эфектыўнасці аб'ектаў, што фінансуюцца, і аб сацыяльных прыярытэтах.

Кожная патрачаная капейка, як неаднаразова гаварыў Прэзідэнт Беларусі, павінна прынесці карысць людзям і дзяржаве, лічыць член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар Гомельскага аддзялення Гандлёва-прамысловай палаты Ксенія Панцюхова. «Менавіта з пазіцыі рэальнай карысці, павышэння агульнага дабрабыту і якасці жыцця беларусаў распрацоўваюцца і зацвярджаюцца праекты інвестыцыйнай праграмы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў плане развіцця эканомікі бягучы год будзе нічым не лягчэйшы за папярэдні, што планаваць праекты трэба максімальна асцярожна і ўдумліва, з аглядкай на расійскі рынак. Эканомія — вось галоўны пасыл», — адзначае парламентарый. «Мы ганарымся тым, што Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, і таму не можам адкладваць будаўніцтва школ, бальніц, дарог, сацаб'ектаў, — кажа Ксенія Панцюхова. — Але неабходна ўдзяляць увагу і абароннаму комплексу, бо жыць пад мірным небам — непераходзячая каштоўнасць. Важна таксама адкрываць новыя вытворчасці, якія рухаюць наперад эканоміку, грамадства, усю нашу краіну. Руплівыя гаспадары заўсёды знойдуць сродкі, каб інвеставаць у будучыню».

Інвестпраграма шмат у чым сфарміравана так, каб максімальна садзейнічаць рэалізацыі ў краіне Года добраўпарадкавання, а гэта значыць, што акцэнт зроблены на інфраструктурных праектах, зазначае член Савета Рэспублікі, старшыня Ушацкага раённага савета дэпутатаў Наталля Марковіч. І прыводзіць у прыклад свой раён: «Ушачане, напрыклад, адразу заўважылі, што ў праграму ўключана рэканструкцыя аўтадарогі Р-46, якая праходзіць праз Ушацкі раён, і работы тым часам на гэтай важнай дарожнай артэрыі ідуць поўным ходам. Калі прааналізаваць геаграфію праектаў, большасць знаходзіцца не ў сталіцы, а гэта значыць, што робіцца ўсё магчымае, каб грамадзяне Беларусі жылі аднолькава камфортна ў любым населеным пункце краіны».

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Андрэй Балыш звяртае ўвагу яшчэ на адзін важны праект дзяржінвестпраграмы: «Адным з ключавых кірункаў гэтай праграмы з'яўляецца ўвага да пытанняў меліярацыі зямель сельскагаспадарчага прызначэння, падтрымка з боку дзяржавы аграрнага сектара і стварэнне ўмоў для ўстойлівага развіцця аграпрамысловага комплексу ў цэлым. Асноўнае фінансаванне будзе накіравана на захаванне і пашырэнне сельскагаспадарчых зямель шляхам мерапрыемстваў па меліярацыі; будаўніцтва, у тым ліку рэканструкцыю асушальных, асушальна-ўвільгатняльных сістэм і асноўных збудаванняў меліярацыйных і водагаспадарчых сістэм».

Гэтыя ўкладанні абавязкова акупяць сябе, лічыць дэпутат: «Павышаючы эфектыўнасць і прадукцыйнасць сельгасугоддзяў, тым самым мы адаптуемся да змяненняў кліматычных умоў, а гэта, несумненна, будзе садзейнічаць умацаванню харчовай бяспекі краіны, дасць магчымасць забяспечыць грамадзян яшчэ больш якаснай прадукцыяй сельскагаспадарчай вытворчасці і будзе спрыяльна ўплываць на далейшае павелічэнне экспартнага патэнцыялу аграпрамысловага комплексу».

### Наталля Качанава:

# «ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ, ЧЫСЦІНЯ Ў ГАРАДАХ І РАЁНАХ — ГЭТА БРЭНД НАШАЙ КРАІНЫ»

## Удасканаленне гэтага брэнда абмеркавалі на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі

Клопат аб краіне і яе добраўпарадкаванне — справа агульная. Таму і акрэсліваць планы, дзяліцца дасягненнямі і вырашаць праблемы варта разам. Галоўным пытаннем пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі стала роля дэпутацкага корпуса ў рэалізацыі задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый.

Старшыні мясцовых Саветаў дэпутатаў абласнога, Мінскага гарадскога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, якія ўзялі ўдзел у пасяджэнні, разам з членамі Савета Рэспублікі абмеркавалі, як зрабіць кожную асобную вобласць і ўсю краіну ў цэлым яшчэ больш акуратнай і камфортнай для людзей.

Адкрываючы пасяджэнне, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** заўважыла, што навядзенне парадку ва ўсіх сферах жыццядзейнасці і стварэнне камфортнага асяроддзя для жыцця грамадзян — адна з ключавых задач, якія стаяць перад краінай.



Фота БелТА.

«Гэта тэма, без перабольшання, датычыцца кожнага з нас, бо парадак і прыгажосць вакол — не толькі залог шчаслівага жыцця, але і важны фактар фарміравання нашай нацыянальнай ідэнтычнасці, культуры і павагі да сваёй зямлі, — звярнула ўвагу спікер. — Гэта паказчык нашай адказнасці і любові да сваёй Радзімы. Як неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт, на зямлі павінен быць ідэальны парадак. Чысціня, эстэтыка — гэта не проста наш брэнд, гэта стыль жыцця і ў рэшце рэшт гэта ж здароўе людзей. Менавіта таму кіраўнік дзяржавы ўдзяляе такую пільную ўвагу гэтай тэме, ставіць перад намі канкрэтныя задачы і патрабуе іх няўхільнага выканання».

Наталля Качанава зрабіла акцэнт на тым, што ў вырашэнні гэтых задач ключавая роля адводзіцца дэпутацкаму корпусу. Па яе словах, менавіта народныя выбраннікі з'яўляюцца сувяззю дзяржаўнай палітыкі з рэальным жыццём на месцах. «Вы павінны забяспечваць эфектыўнае ўзаемадзеянне паміж уладай і грамадствам, ствараючы ўмовы для актыўнага ўдзелу грамадзян у развіцці і паляпшэнні тэрыторый. Бо вы лепш за іншых ведаеце, якія пытанні патрабуюць першачарговага вырашэння ў вашых рэгіёнах», — звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі да калег.

### «НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА»



Спікер адзначыла, што палітыка, якая праводзіцца ў дзяржаве, накіравана на павышэнне дабрабыту і якасці жыцця грамадзян. За апошнія гады нямала зроблена для стварэння камфортнага асяроддзя, якое садзейнічае развіццю вялікіх і малых населеных пунктаў, паляпшэнню інфраструктуры. «Нам ёсць чым ганарыцца! Сёння, сапраўды, парадак на зямлі, чысціня і парадак у нашых гарадах і раёнах — гэта брэнд нашай краіны», — канстатавала Наталля Качанава. У прыклад яна прывяла рэальныя факты. За тры дзесяцігоддзі амаль у два разы павялічыўся кіламетраж дарог з цвёрдым пакрыццём, на сёння гэта амаль 90 тысяч кіламетраў. Толькі з пачатку бягучай пяцігодкі аб'ёмы фінансавання рамонту і рэканструкцыі аўтамабільных дарог і маставых збудаванняў на іх павялічыліся больш як у два разы. У парадак прыводзяцца не толькі дарогі, але і тэрыторыі каля іх, устаноўлена каля дзвюх тысяч малых архітэктурных форм, высаджана больш за 200 тысяч дрэў. Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што за гэты перыяд рэалізаваны маштабныя задачы па развіцці інфраструктуры населеных пунктаў. Адрамантавана больш за 20 тысяч квадратных метраў вулічна-дарожнай сеткі; абноўлена і рэканструявана звыш 5 тысяч прыдамавых тэрыторый, высаджана амаль 3 мільёны дрэў і кустоў; устаноўлена больш за 15 тысяч кантэйнерных пляцовак для збору адходаў; знесена больш за 17 тысяч пустых і трухлявых жылых дамоў. Працягваецца работа па падтрыманні ў належным стане месцаў пахавання, тэрыторый садаводчых таварыстваў, гаражных кааператываў, а таксама запаведнікаў і заказнікаў.

«Але нам трэба яшчэ шмат зрабіць, — акцэнтавала Наталля Качанава. — У гэтай працы важная роля кожнага: і органаў дзяржаўнай улады, і службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, прадпрыемстваў усіх форм уласнасці і, вядома, грамадзян нашай краіны». Яна падкрэсліла, што для дасягнення пастаўленых задач мясцовыя Саветы дэпутатаў усіх узроўняў павінны актыўна ўдзельнічаць у распрацоўцы і рэалізацыі рэгіянальных праграм па комплексным развіцці тэрыторый, забяспечваць своечасовае і якаснае выкананне запланаваных мерапрыемстваў.

«Асаблівую ўвагу дэпутацкаму корпусу трэба ўдзяліць мясцовым ініцыятывам па добраўпарадкаванні. Уцягванне грамадзян у гэты працэс — адна з найважнейшых задач мясцовых Саветаў. Неабходна падтрымліваць і заахвочваць грамадзянскія ініцыятывы, ствараць умовы для актыўнага ўдзелу насельніцтва ў навядзенні парадку як на асобна ўзятых прыдамавых тэрыторыях, так і ў цэлым у сёлах, гарадах, раёнах», — адзначыла Наталля Качанава. Спікер падкрэсліла, што ў год святкавання 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне неабходна пільную ўвагу ўдзяліць уладкаванню мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войн, месцаў масавага пахавання грамадзянскага насельніцтва.

### «ДЗЕ ПАРАДАК, ТАМ І ЛАД»

Наталля Качанава адзначыла, што беларусы ганарацца сваёй краінай, таму ў Год добраўпарадкавання і пяцігодку якасці трэба зрабіць яе яшчэ больш цудоўнай. «Кожны павінен рабіць сваю справу адказна, разумеючы, што робіць гэта не толькі для сябе, але і на карысць сваёй краіны і будучых пакаленняў. Бо, як кажуць у Беларусі, дзе парадак, там і лад, — падсумавала яна.

Старшыню Савета Рэспублікі пацікавіліся не толькі дасягненнямі, але і праблемамі, якія трэба вырашыць, каб работа па добраўпарадкаванні была яшчэ больш эфектыўнай. Удзельнікі пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі шчыра і адкрыта абмеркавалі шырокі спектр пытанняў, звязаных з рэалізацыяй пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач. Сярод іх — арганізацыя работы садовых таварыстваў, меры, якія прымаюцца, каб даць новае жыццё закінутым дамам, добраўпарадкаванне могілак і памятных месцаў і шэраг іншых пытанняў, ад якіх залежыць парадак, а значыць, і лад на зямлі.

Удзельнікі пасяджэння дзяліліся досведам сваіх раёнаў, якія могуць пераняць і іншыя. Напрыклад, старшыня Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў Марыя Клімовіч расказала, як жыхары раёна разам займаюцца азеляненнем тэрыторый. А старшыня Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў Ірына Краўчук расказала пра дапамогу сельскіх старастаў у добраўпарадкаванні сельскіх тэрыторый.

### «ДА ГЭТАЙ РАБОТЫ ПАВІННЫ ПАДКЛЮЧЫЦЦА ЎСЕ»

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ** у размове з журналістамі звярнуў увагу, што якасць жыцця, Год добраўпарадкавання азначаюць больш, чым толькі чысціню вуліц ці дагледжанасць паркаў. «Гэта наша стаўленне да сваёй роднай зямлі, да сваёй Айчыны. Таму, вядома, у гэту работу павінны ўключыцца ўсё. А дэпутацкі корпус пры гэтым павінен узяць на сябе кансалідуючую ролю, таму што немагчыма займацца добраўпарадкаваннем, аддаўшы гэту работу на водкуп жыллёва-камунальнай гаспадарцы або іншым спецыялізаваным арганізацыям. Павінны далучыцца абсалютна ўсе: установы, арганізацыі, ініцыятыўныя грамадзяне. Толькі тады мы зможам зрабіць нашу краіну яшчэ больш прыгожай і дагледжанай. Прычым і ў глабальным маштабе, і ў кожным канкрэтным населеным пункце», — падкрэсліў ён.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля МАРКОВІЧ** адказвае за Ушацкі раён, у якім узначальвае раённы Савет дэпутатаў. Яна расказала, што жыхары раёна з вялікім пазітывам адгукаюцца на ініцыятывы, звязаныя з добраўпарадкаваннем, самі выступаюць з адпаведнымі прапановамі. Зразумела, не застаюцца ўбаку дэпутацкі корпус, актыў раёна, старшыні сельсавета і грамадскія аб'яднанні. Па словах Наталлі Марковіч, людзі выдатна разумеюць, што толькі самі могуць зрабіць свой раён, вобласць, краіну лепшымі. «Літаральна два дні таму адбылося чарговае пасяджэнне абласнога штаба па добраўпарадкаванні, дзе былі пастаўлены вельмі сур'ёзныя задачы. Мы актыўна рыхтуемся да гэтай вялікай працы. Распрацоўваецца план мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні ў раёне, да 1 сакавіка ён будзе падпісаны раённым выканаўчым камітэтам, зацверджаны і прыняты да выканання. Акрамя таго, будзе распрацаваны і зацверджаны дадатковы комплекс мерапрыемстваў па Годзе добраўпарадкавання», — расказала Наталля Марковіч. Яна заўважыла, што ва Ушацкім раёне пераважае сельскае насельніцтва, таму акцэнт — на паляпшэнне якасці жыцця людзей на вёсцы. «Асаблівую ўвагу ўдзелім дарогам, азеляненню нашага гарадскога пасёлка Ушачы. Традыцыйна ў поле зроку — помнікі, воінскія пахаванні. Гэта значыць, работа, якая ўжо праводзілася, будзе прадоўжана», — адзначыла сенатар.

### «ЗРОБЛЕНАЕ СУМЕСНА, СВАІМІ РУКАМІ ДАРАГОГА ВАРТА»

**Старшыня Хадасоўскага сельскага Савета дэпутатаў Мсціслаўскага раёна Анатоль ПРУДНІКАЎ** заўважыў, што работа па добраўпарадкаванні праводзіцца пастаянна, але ў Год добраўпарадкавання ёй будзе ўдзяляцца яшчэ больш увагі. Безумоўна, максімальна задзейнічаюць мясцовых жыхароў. «Будзем рэалізоўваць задуманыя ідэі і ініцыятывы, якія намецілі на год. Планы амбіцыйныя: стварэнне некалькіх архітэктурных форм, устаноўка памятнага знака да стагоддзя ўтварэння нашага сельскага Савета. Вопыт ёсць, нядаўна стварылі Алею герояў у аграгарадку Хадасы, на якой размясціліся тры памятныя знакі нашым заслужаным землякам. Усё гэта робіцца сумесна з нашымі грамадзянамі», — расказаў Анатоль Пруднікаў. Па яго словах, сумесная праца фарміруе культуру паводзін грамадзян. «Зробленае сумесна, сваімі рукамі дарагога варта. І людзі больш адказна ставяцца да гэтага. Прычым, калі мы толькі пачыналі, пераважалі ў асноўным людзі сталыя. Але з часам, бачачы зробленае, у тым ліку для моладзі, сталі ўсё больш уключацца ў агульную работу і маладыя людзі. Яны ўжо самі прыходзяць да нас з ініцыятывамі. Так, у 2023—2024 гадах у нас быў створаны цэлы спартыўны гарадок. І вельмі прыемна, што моладзь не застаецца ўбаку, прыходзіць цэлымі сем'ямі», — адзначыў ён.

Анатоль Пруднікаў звярнуў увагу, што сумесная работа аб'ядноўвае не толькі жыхароў аднаго населенага пункта, але і кансалідуе ўсю нацыю. Ён успомніў гістарычны досвед беларускага народа: «Калі казаць па-простаму, гэта тая самая талака, якая раней была і гуртавала людзей. Мы не павінны саромецца гэтага слова. І такой вось талакой рухаць нашу моладзь і наш народ наперад, каб разам рабіць вялікія справы».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Ігар Сергяенка:

# «НЕАБХОДНА НАДАЦЬ ІМПУЛЬС РЭАЛІЗАЦЫІ ЗАПАТРАБАВАНЫХ ІНВЕСТПРАЕКТАЎ»

## На семінары-нарадзе, які прайшоў на базе «Вялікага каменя», абмяркоўваўся інвестыцыйны і экспартны патэнцыял эканомікі

У прысутнасці дэпутацкага корпуса з удзелам зацікаўленых ведамстваў разглядаўся інвестыцыйны і экспартны патэнцыял беларускай эканомікі. Невыпадкова пытанні на гэтую тэматыку атрымалі шырокае гучанне на пляцоўцы Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, які ўяўляе сабой асаблівую эканамічную зону, дзе размешчаны высокатэхналагічныя і імпартазамяшчальныя інавацыйныя вытворчасці з высокім экспартным патэнцыялам.

Вывучэнне практычных пытанняў рэалізацыі інвестыцыйнай палітыкі Беларусі, кірункаў развіцця экспартнага патэнцыялу для актывізацыі прасоўвання беларускіх тавараў на знешнія рынкі дазволіць выявіць праблемы ў сферы дзяржаўнага рэгулявання інвестыцыйнай дзейнасці і магчымыя рэзервы экспартнага патэнцыялу беларускай эканомікі. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у сваю чаргу, гатовы падставіць заканадаўчае плячо.

### ЛАГІСТЫЧНЫЯ ПЕРАВАГІ І ПАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ

**Кіраўнік адміністрацыі Кітайска–Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Аляксандр ЯРАШЭНКА** азнаёміў удзельнікаў мерапрыемства з гісторыяй парка, асноўнымі кірункамі дзейнасці і ўмовамі для рэзідэнтаў. Ен звярнуў увагу на тое, што ў парку працуе 114 рэзідэнтаў з 14 краін свету. «Вялікі камень» прываблівае новых рэзідэнтаў, аб чым сведчыць у тым ліку той факт, што з 2015 года на тэрыторыі парка ўзведзена 87 будынкаў і збудаванняў. У праекце — пабудаваць яшчэ 48 аб'ектаў, 19 з якіх ужо знаходзяцца на стадыі ўзвядзення.

Дэпутаты на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў наведалі асобныя вытворчыя прадпрыемствы, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі «Вялікага каменя». У прыватнасці, парламентарыі азнаёміліся з узорамі беспілотных лятальных апаратаў і звышлёгкай пілатаванай авіяцыйнай тэхнікі, што вырабляюцца Кітайска-Беларускім сумесным прадпрыемствам «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы». Наведалі і завод «КУВО», які з'яўляецца найбуйнейшым у СНД вытворцам шкла для наземнага пасажырскага транспарту. На беларускім прадпрыемстве, якое вядзе сваю вытворчую дзейнасць на працягу 30 гадоў (сёмы з іх — на пляцоўцы «Вялікага каменя»), ствараюць шкло і для тэхнікі сельскагаспадарчага прызначэння. Асноўнымі партнёрамі завода з'яўляюцца такія айчынныя флагманы, як МТЗ, МАЗ, Гомсельмаш.

Як распавяла **намеснік дырэктара па эканоміцы прадпрыемства «КУВО» Вікторыя БАРЫСАВА,** з нядаўняга часу на заводзе асвойваюць новую прадукцыю — шкло для чыгуначнага транспар-



ту і метрапалітэна. «Рэзідэнтамі «Вялікага каменя» мы сталі ў 2018 годзе, вытворчасць запусцілі ў 2021 годзе, — удакладніла яна. — Індустрыяльны парк вельмі прывабны як сваім геаграфічным становішчам, так і падатковымі льготамі. У прыватнасці, падаходны падатак з фізічных асоб складае 9 %, калі ва ўсёй краіне 13 %. Гэта выгадна для супрацоўнікаў нашага прадпрыемства».

### РЭАЛЬНЫ ЭФЕКТ ЗАКАНАДАЎЧЫХ РАШЭННЯЎ

Адкрываючы пленарнае пасяджэнне, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** нагадаў, што 5 лютага кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ № 49, якім зацверджана Дзяржаўная інвестыцыйная праграма на бягучы год. «Прадугледжваецца фінансаванне 82 аб'ектаў на суму больш за 2 мільярды рублёў, з іх 40 плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета, — канкрэтызаваў ён. — У асноўным, гэта сацыяльныя і інфраструктурныя праекты. Мяркую, усе мелі магчымасць гэтую праграму вывучыць, азнаёміцца і выкарыстоўваць пры арганізацыі сваёй работы ў выбарчых акругах: як у плане давядзення інфармацыі да насельніцтва, так і ў плане рэалізацыі мерапрыемстваў па ажыццяўленні парламенцкага кантролю».

Надаць імпульс рэалізацыі новых, запатрабаваных у нашай краіне інвестыцыйных праектаў, па меркаванні спікера, павінен і абноўлены Закон «Аб інвестыцыях», які ўступіў у сілу паўгода таму.

**Толькі за мінулы год з удзелам дэпутацкага корпуса ратыфікавана 16 міжнародных пагадненняў, якія будуць садзейнічаць прыцягненню фінансавых сродкаў у нашу краіну і развіццю знешняга гандлю. Па словах Ігара Сергяенкі, прыняты сёлета Закон «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Кітайскай Народнай Рэспублікі аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый» дасць магчымасць пашырыць і забяспечыць дыверсіфікацыю гандлю краінамі, стварыць больш спрыяльны рэжым для беларускіх і кітайскіх партнёраў.**

«Правядзенне семінара-нарады на базе Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» накіравана на вырашэнне наступных задач, — агучыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў і канкрэтызаваў: — Першая — абмеркаваць пытанні рэалізацыі інвестыцыйнай і экспартнай палітыкі. Другая — пазнаёміцца са станоўчымі прыкладамі ўкладання капіталу ў стварэнне новых вытворчасцяў».

У «Вялікім камені», як падкрэсліў Ігар Сергяенка, створана ўнікальная экасістэма, якая дазваляе рэалізоўваць высокатэхналагічныя, канкурэнтаздольныя інавацыйныя праекты з высокім экспартным патэнцыялам. «Мы пазнаёміліся з работай асобных прадпрыемстваў, змаглі ўбачыць, які эканамічны эфект для нашай краіны мела стварэнне і развіццё парка, увядзенне льготных умоў для яго рэзідэнтаў, — адзначыў ён. — Самае галоўнае, што парк развіваецца, ёсць перспектыўныя праекты».




### ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАСЦЬ І НАВУЧАЛЬНЫ ХАРАКТАР

Як звярнуў увагу **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР,** нягледзячы на беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск, Беларусь пашырае сваю прысутнасць на рынках сяброўскіх краін. Ён удакладніў, што рэкордныя аб'ёмы беларускай прадукцыі летась былі пастаўлены ў афрыканскія краіны.

Кажучы аб інвестыцыйнай палітыцы ў Беларусі, міністр эканомікі назваў яе два ключавыя блокі. Першы — інстытуцыйныя меры: дзякуючы дэпутацкаму корпусу, істотна абноўлены дзеючыя і ўкаранёны новыя інструменты стымулявання перспектыўных бізнес-ідэй. У прыватнасці, размова ідзе аб спецыяльным інвестыцыйным дагаворы і прэферэнцыйных інвестпраектах.

Другі блок інвестыцыйнай палітыкі звязаны з праектнай дзейнасцю. «Ключавое тут — ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект», — канкрэтызаваў міністр. — Нагадаю, што яна ішла дастаткова складана. У нас 129 рэгіёнаў, было 120 праектаў і шэсць бізнес-ідэй. Сёння гэта 220 праектаў. З іх на гэты год мы зацвердзілі 200». Такі поспех, па яго словах, найперш звязаны з камфортнымі крэдытнымі стаўкамі.

**Старшыня Беларускай гандлёва–прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ** расказаў аб прасоўванні беларускіх тавараў за мяжой. «Першы інструмент — гэта рэалізацыя выставачных мерапрыемстваў у забеспячэнні ўдзелу беларускіх экспарцёраў у спецыялізаваных міжнародных выстаўках за мяжой, — канкрэтызаваў ён. — Вельмі запатрабаваны эфектыўны інструмент для замацавання асвоеных рынкаў, пошуку новых ніш і адкрыцця новых рынкаў».

Наступным інструментам, па яго словах, з'яўляецца правядзенне дзелавых візітаў, бізнес-місій з арганізацыяй прэзентацый. «Усяго ў 2024 годзе Беларуская гандлёва-прамысловая палата арганізавала 90 дзелавых візітаў за мяжу і 80 бізнес-місій у Рэспубліцы Беларусь, якія праходзілі на нашых пляцоўках», — сказаў Міхаіл Мятлікаў. Сярод іншых інструментаў прасоўвання беларускіх тавараў за мяжой — арганізацыя кангрэсаў, канферэнцый, сімпозіумаў, а таксама міжнароднае супрацоўніцтва Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, прадстаўніцтва якой ёсць у 33 краінах.

У размове з журналістамі Старшыня Палаты прадстаўнікоў рэзюмаваў, што семінар-нарада, як і задумвалася, атрымаўся практыкаарыентаваным і меў навучальны характар.

**«Адна з задач, якая будзе стаяць перад дэпутатамі, — на месцах, у рэгіёнах, даводзіць інфармацыю і канкрэтна прымаць удзел у распрацоўцы і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў», — канкрэтызаваў спікер.**

— Сёння ўсе дэпутаты атрымалі ўяўленне аб тым, як рэалізоўваецца інвестыцыйны, экспартны патэнцыял на прыкладзе Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка. Нам ёсць што сёння рэалізоўваць, ёсць вялікі попыт на нашу прадукцыю — прагучала справаздача міністра эканомікі па выніках за мінулы год. У плане давядзення інфармацыі, рэкламы — гэта сумеснае поле дзейнасці і дэпутацкага корпуса, і іншых дзяржаўных органаў нашай краіны», — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

*Смалявіцкі раён.*

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **государственного учреждения «Воложинский районный учебно-методический кабинет»** (222357, Минская область, г. Воложин, ул. Партизанская, 15), проводит открытый аукцион по продаже

**автомобиля легкового седана VOLKSWAGEN POLO, 2012 г. в., регистрационный знак 6150 IH-5, кузов (VIN) № XW8ZZZ61ZDG002036, цвет темно-синий, находящегося по адресу:** 222357, Минская область, г. Воложин, ул. Партизанская, 15**.**

**Начальная цена** (без НДС) – **10 700,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 070,00** бел. руб.).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **17.03.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2025** до **17.00. Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 136-31-11.**

**Тел. для осмотра транспорта +375 29 334 97 14, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНП 691995624

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении электронного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **ГУ «Стародорожский районный центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций»** (222932, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, д. 38), проводит открытый аукцион по продаже:

**лот № 1: автобус MAZ 241000, 2013 г. в., кузов (VIN) Y3M241000D0000060, регистрационный знак АН 3279-5, цвет – желтый), находящийся по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Чапаева, 26.**

**Начальная цена** (без НДС) – **9 633,40** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **963,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 80 %.**

**Лот № 2: автобус MAZ 241S00, 2014 г. в., кузов (VIN) Y3M241S00E0000195, регистрационный знак АО 2470-5, цвет – желтый), находящийся по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Чапаева, 26.**

**Начальная цена** (без НДС) – **10 766,60** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 076,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 80 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 07.09.2024, 30.10.2024.

Электронные торги состоятся **03.03.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.02.2025** до **17.00. Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11**

УНП 690727164

## Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»!
## 13 марта 2025 года в 14.30 состоится годовое общее собрание акционеров

Место проведения собрания: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал.

**Повестка дня**

1) Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях деятельности Общества на 2025 год.

2) О работе Наблюдательного совета в 2024 году.

3) О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и обязательного аудита достоверности годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества.

4) Об утверждении бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2024 год.

5) О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за 2024 год.

6) Об утверждении направлений использования чистой прибыли Общества в 2025 году. Периодичность выплаты дивидендов в 2025 году.

7) О внесении изменений в Устав ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции».

8) Об утверждении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

9) Об избрании членов наблюдательного совета.

10) Об избрании членов ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 19 февраля по 12 марта 2025 г. по месту нахождения Общества: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 5-й этаж, кабинет бюро менеджмента качества с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), в день проведения собрания 13 марта 2025 года – по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.30.

При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров будет сформирован по состоянию на 03.02.2025 года.

Наблюдательный совет

УНП 600122771 (8-0174-261754)

# ЗАГЛЯНЕМ У ЖЫРОЎКУ

## Колькі беларусы ў 2025 годзе будуць плаціць за камуналку?

Колькі прыйдзецца заплаціць за жыллёва-камунальныя паслугі ў бягучым годзе, распавёў журналістам першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ, каментуючы пастанову Савета Міністраў, якім устаноўлены тарыфы на ЖКП на 2025 год.



— Данае рашэнне прынята ў развіццё ўказа кіраўніка дзяржавы, у якім устаноўлены гранічныя значэнні тарыфаў на бягучы год. Асноўная канцэпцыя некалькі гадоў ужо не мяняецца: рост сукупнага плацяжу па стандартнай двухпакаёвай кватэры з трыма жыхарамі не павінен перавысіць паловы базавай велічыні, якая ўстаноўлена на бягучы год. У адпаведнасці з данымі падыходамі і ўстаноўлены тарыфы, — адзначыў Іван Вежнавец.

Захоўваюцца падыходы па этапнасці павышэння. На першым этапе ўзрастуць тарыфы на ЖКП, якія выйшлі на стопрацэнтны ўзровень кампенсацыі выдаткаў.

Як адзначыў Іван Вежнавец, кампенсуюцца выдаткі, якія маюць аб'ектыўны характар і звязаныя з ростам заработнай платы абслугоўваючага персаналу.

— Другі этап прадугледжваецца з 1 чэрвеня 2025 года. Даныя падыходы адлюстраваны ва ўказе кіраўніка дзяржавы. Разам з тым рашэнне аб павышэнні тарыфаў на ацяпленне будзе прымацца летам з улікам існай сітуацыі па інфляцыі, а таксама росту даходаў насельніцтва, — дадаў першы намеснік міністра.

Як паведамлялася, цэны (тарыфы) устанаўліваюцца з 1 студзеня 2025 года зыходзячы з падыходаў, якія прадугледжваюць размеркаванне прыросту плацяжоў па тыпавой кватэры ў памеры 21 рубля, або 0,5 базавай велічыні, паміж усімі жыллёва-камунальнымі паслугамі.

Цэны на прыродны газ не змяніліся і засталіся на ўзроўні 2024 года.

Тарыфы на электраэнергію для насельніцтва з 1 студзеня 2025 года павышаюцца на 11,9 %.

Для тыпавой кватэры пры нарматыўным спажыванні электрычнай энергіі гэта складзе 4, 51 рубля.

Цэны на звадкаваны газ для насельніцтва ў 2025 годзе павялічаны на 5 %. Так, кошт балона звадкаванага газу вагой 21 кг у межах нарматыўнага спажывання — 24,5 рубля.

**Паводле БелТА.**

# ЯКАСЦЬ — У АСНОВЕ

## З якімі вынікамі транспартны комплекс спрацаваў у 2024 годзе?

Пасяджэнне выніковай калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый прайшло пад старшынствам міністра Аляксея ЛЯХНОВІЧА. У мерапрыемстве прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнай улады, кіраўнікі прадпрыемстваў, паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Як было адзначана на калегіі, у 2024 годзе, які прайшоў у краіне пад знакам якасці, у транспартнай галіне ўсе сілы былі мабілізаваны на павышэнне яе канкурэнтаздольнасці, тэхнічнае пераасняшчэнне, паляпшэнне ўмоў працы. Доля валавой дабаўленай вартасці па транспартнай дзейнасці ў структуры ВУП рэспублікі вырасла з 4,9 % да 5,1 % па выніках мінулага года. На транспартныя паслугі прыпадае 50 % аб'ёму экспарту паслуг краіны.

Працягваецца работа па фарміраванні аптымальных лагістычных схем дастаўкі беларускай экспартнай прадукцыі на знешнія рынкі. Калі казаць пра чыгуначны транспарт, рост аб'ёмаў кантэйнерных перавозак у напрамку Кітай — Беларусь — Кітай склаў 144,3 %.

У дарожна-будаўнічай сферы па выніках 2024 года адрамантавана і рэканструявана 5,3 тысячы км дарог рэспубліканскага і мясцовага значэння, а таксама 6,4 тысячы пагонных метраў маставых збудаванняў на іх (121 мост).

— Дзякуючы павелічэнню аб'ёмаў работ па бягучым рамонце дарожнага пакрыцця ямачнасць на аўтамабільных дарогах агульнага карыстання знізіліся амаль у 4 разы, крытычная ямачнасць — у 11 разоў. Так, адрамантавана амаль 12 % рэспубліканскіх дарог ад іх агульнай працягласці, якая складае 16 тысяч кіламетраў, — адзначыў міністр транспарту і камунікацый Аляксей Ляхновіч.

У 2024 годзе транспартным комплексам забяспечана выкананне ўсіх мэтавых паказчыкаў. Экспарт транспартных паслуг склаў 4,5 мільярда долараў, або 119,6 % да 2023 года. Па відах транспарту: аўтамабільны — 112,4 %, чыгуначны — 133,8 %, паветраны — 113,4 %.

Рост інвестыцый у асноўны капітал склаў 137,4 %. Абнаўляецца рухомы састаў. За мінулы год набыта каля 2700 адзінак грузавога чыгуначнага рухомага саставу, а таксама



695 транспартных сродкаў аўтамабільнага і гарадскога электрычнага пасажырскага транспарту. Для ўтрымання аўтамабільных дарог набыта звыш 890 адзінак дарожнай і камунальнай тэхнікі.

Профільны міністр акцэнтаваў увагу на стратэгічных кірунках развіцця ўсіх падгалін транспартнага комплексу ў 2025 годзе.

У сферы аўтамабільнага і гарадскога электрычнага транспарту гэта ўдасканаленне маршрутнай сеткі і стварэнне новых сэрвісаў абслугоўвання для пасажыраў.

У галіне чыгуначнага транспарту ў ліку ключавых задач — нарошчванне аб'ёмаў кантэйнерных перавозак, паветранага транспарту: павелічэнне аб'ёмаў перавозак пасажыраў за кошт адкрыцця новых напрамкаў, папаўненне парка паветраных суднаў.

Будаўнічыя работы па абнаўленні дарожнай інфраструктуры будуць выконвацца ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2025 год. Трэба будзе рэканструяваць 11 аб'ектаў рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі.

Як адзначыў Аляксей Ляхновіч, у Год добраўпарадкавання і пяцігодку якасці прыярытэтамі ў галіне стануць стварэнне сучаснай, зручнай і бяспечнай транспартнай інфраструктуры, абнаўленне рухомага саставу, лічбавізацыя тэхналагічных і бізнес-працэсаў на транспарце.

Міністр акцэнтаваў увагу на важных праектах, якія плануецца рэалізаваць у найбліжэйшай перспектыве:

— Патрабуецца прыступіць да рэалізацыі праектаў па хуткасных транспартных зносінах з Мінска ў Нацыянальны аэрапорт Мінск, мадэрнізацыі інфраструктуры для развіцця хуткіх і камфортных транспартных зносін паміж Мінскам і яго гарадамі-спадарожнікамі.

Выступаючы на калегіі з заключным словам, намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак звярнуў увагу кіраўнікоў галіновых арганізацый на неабходнасць сканцэнтраваць намаганні на выкананні паказчыкаў мэтавага плана.

У галіне аўтамабільных пасажырскіх перавозак віцэ-прэм'ер адзначыў важнасць забеспячэння насельніцтва надзейным транспартным паведамленнем.

Асобна Анатоль Сівак спыніўся на тэме якасці.

— Усе пытанні, звязаныя з якасцю, павінны быць першараднымі. Найважнейшым паказчыкам якасці ў галіне з'яўляецца бяспека транспартнай дзейнасці, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

# РАЗЛІК НА МЕСЦЫ

## Мінсувязі: якасць сувязі ў рэгіёнах — на асаблівым кантролі

**Ва ўчарашнім нумары мы інфармавалі аб праведзеным апытанні МАРГ спажыўцоў адносна праблем, якія ўзнікаюць пры безнаяўнай аплаце тавараў і паслуг, замовах у інтэрнэт-крамах. У апытанні пацвярджалася наяўнасць асобных праблем з сувяззю ў сельскай мясцовасці пры аплаце тавараў банкаўскай картай у крамах і аўтакрамах, афармленні заказу і (або) аплаце тавараў у інтэрнэт-крамах, а таксама пры аплаце паслуг праз інтэрнэт з выкарыстаннем сетак сотавай сувязі.**

Вынікі аналізу былі накіраваны ў Мінсувязі. У сваю чаргу ў профільным міністэрстве пракаментавалі:

— Пытанні якасці паслуг сотавай сувязі знаходзяцца на пастаянным кантролі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, у цяперашні час ужо прыняты шэраг канкрэтных мер.



У Мінсувязі патлумачылі, што толькі за 2024 год спецыялізаванымі мабільнымі апаратна-праграмнымі комплексамі дзяржаўнага прадпрыемства «БелДІЭ» былі праведзены работы па кантролі якасці паслуг сотавай сувязі на ўсёй тэрыторыі краіны, пры гэтым аб'ём вымярэнняў і працягласць абследаванняў тэрыторыі склалі: 20,8 мільёна вымярэнняў параметраў якасці паслуг тэлефоннай сувязі і перадачы даных; 342 тысячы км — сумарная працягласць маршрутаў вымярэнняў на аўтадарогах Беларусі і тэрыторыях населеных пунктаў.

Па выніках праведзеных работ абследаваны ўсе 3,2 тысячы км аўтадарог катэгорыі М, 12,2 тысячы км аўтадарог катэгорыі Р.

Таксама абследаваны тэрыторыі 11 220 населеных пунктаў.

Для павышэння аб'ектыўнага кантролю якасці сотавай сувязі ў красавіку 2023 года адбыўся запуск распрацаванага дзяржаўным прадпрыемствам «БелДІЭ» партала ацэнкі якасці паслуг электрасувязі ХВАЛЯ.БЕЛ і мабільнага дадатку «Хваля», з дапамогай якіх любы карыстальнік паслуг сотавай сувязі можа ацаніць параметры якасці сетак сотавай сувязі ў населеным пункце, які яго цікавіць, а з дапамогай мабільнага дадатку, устаноўленага на асабісты тэлефон, непасрэдна зрабіць праверку ўзроўню і ацэнку якасці сігналу сотавай сувязі ў канкрэтным пункце.

— Вынікі такіх вымярэнняў акумулююцца на серверах «БелДІЭ», што дазваляе дадаткова інфармаваць аператараў сотавай сувязі аб магчымых праблемах якасці паслуг, — пракаментавалі ў профільным міністэрстве.

Тут нагадалі, што для развіцця сетак сотавай сувязі і вырашэння наспелых пытанняў па якасці сотавай сувязі прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2024 г. № 335 «Аб аказанні паслуг сотавай рухомай электрасувязі», у адпаведнасці з якім аператары абавязаны развіваць інфраструктуру сваіх сетак, выконваць патрабаванні да ахопу тэрыторыі краіны паслугамі сотавай сувязі і іх якасці. Кантроль за выкананнем дадзеных патрабаванняў ускладзены на дзяржаўнае прадпрыемства «БелДІЭ».

У развіццё ўказа адпаведнай пастановай Савета Міністраў упершыню зацверджаны патрабаванні да ахопу тэрыторыі Беларусі паслугамі сотавай сувязі і іх якасці, якімі прадугледжваецца паэтапнае павелічэнне ахопу тэрыторыі краіны і хуткасці перадачы даных у сетцы 4G (да 2030 года ахоп тэрыторыі сеткай 4G — 99 %, сярэдняя хуткасць перадачы даных у абласных цэнтрах і Мінску — 70 Мбіт/с, у раённых цэнтрах, гарадах і гарадскіх пасёлках — 60 Мбіт/с і на астатняй тэрыторыі — 30 Мбіт/с). Выкананне гэтых патрабаванняў будзе жорстка кантраляваць «БелДІЭ».

— Уся гэта работа ўжо дала вынік, пачата актыўнае праектаванне і будаўніцтва сетак сотавай сувязі па ўсёй краіне, асабліва ў маланаселенай сельскай мясцовасці, — расказалі ў ведамстве і агучылі лічбы: — Толькі за 2024 год уведзена ў эксплуатацыю больш за 2,3 тысячы базавых станцый сотавай сувязі, іх агульная колькасць павялічылася на 7 % і складае больш за 40 тысяч. На працягу 2024 года пачаты работы па праектаванні і будаўніцтве 400 веж сотавай сувязі ў маланаселенай сельскай мясцовасці, з якіх 100 плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ўжо ў бягучым годзе.

Паводле Мінсувязі, усяго да канца 2030 года плануецца пабудаваць і ўвесці ў эксплуатацыю больш за 800 аб'ектаў (веж) сотавай сувязі.

— Але і сёння ёсць шэраг практычных рашэнняў, якія дазваляюць палепшыць якасць сувязі, — пагаджаюцца ў ведамстве. У якасці прыкладу тут прыводзяць РУП «Белпошта», дзе для арганізацыі работы «Мабільная паштальёна» ў маланаселенай сельскай мясцовасці і забеспячэння высокай якасці абслугоўвання на машынах прадпрыемства выкарыстоўваюцца ўзмацняльнікі сігналу сотавай сувязі.

У ведамстве адзначылі, што такое тэхнічнае рашэнне можа быць выкарыстана і ўладальнікамі аўтакрамаў.

— Для касавых апаратаў у сельскіх крамах мэтазгодна выкарыстоўваць існуючую сетку РУП «Белтэлекам», бо там ужо ёсць тэлефонная сувязь. РУП «Белтэлекам» гатовы ў кароткі тэрмін забяспечыць работу такіх касавых апаратаў, — падкрэслілі ў Мінсувязі і запэўнілі, што ведамства заўсёды адкрыта для канструктыўнага дыялогу ў мэтах вырашэння любых пытанняў у галіне сувязі, якія ўзнікаюць.

Што датычыцца вынікаў аналізу інфармацыі МАРГ, у Мінсувязі дадалі:

— Для выпрацоўкі ўзгодненых рашэнняў плануецца правядзенне сумеснай нарады з прадстаўнікамі МАРТ, РУП «Белтэлекам», мабільных аператараў і іншых зацікаўленых. Аб яго выніках і прынятых рашэннях грамадскасць будзе праінфармавана дадаткова.

# СТЫМУЛ ДЛЯ АКТЫЎНЫХ

## Прэмія ўрада накіравана на заахвочванне асабістага ўкладу працаўнікоў у агульны эканамічны вынік краіны

**Пра гэта заявіў першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН у эфіры «Першага інфармацыйнага» тэлеканала, паведамляе прэс-служба Мінэканомікі.**

Па словах Андрэя Картуна, эканоміка — гэта праца калектыўная, але ад кожнага грамадзяніна паасобку таксама залежыць нямала. Таму галоўная асаблівасць новай прэміі — заахвоціць індывідуальны ўклад таленавітых, інавацыйна думаючых і захопленых сваёй справай людзей.

Першы намеснік міністра эканомікі нагадаў, што конкурс праходзіць па дзвюх намінацыях («За значны ўнёсак у развіццё вытворчасці і сферы паслуг» і «За дасягненні ў галіновай навуцы») і ў некалькі этапаў.

Прыём заявак ад аблвыканкамаў і органаў-рэгулятараў ужо ідзе і завяршаецца 31 сакавіка.

На другім этапе (з 1 красавіка да 1 ліпеня) міжведамасная камісія на чале з міністрам эканомікі будзе праводзіць адбор кандыдатаў зыходзячы з крытэрыяў, якія замацаваны пастановай урада № 455.

Трэці этап (з 1 верасня) — канчатковае падвядзенне вынікаў і вызначэнне пераможцаў.

Андрэй Картун таксама адказаў на пытанне, што атрымаюць лепшыя з найлепшых.

— Сур'ёзны стымул стаць уладальнікам гэтай ганаровай і значнай узнагароды — грашовая прэмія ў 42 тысячы беларускіх рублёў. Гэта вельмі важкі прыз: ёсць за што пазмагацца. «Іміджавы падарунак» чакае і арганізацыі, дзе працуюць пераможцы, — усеагульная пазнавальнасць сваёй прадукцыі. У гэтым сёння залог далейшага паспяховага развіцця, — адзначыў першы намеснік міністра эканомікі.

Андрэй Картун заклікаў перадавыя прадпрыемствы і працоўныя калектывы больш актыўна падаваць свае заяўкі. А тым, хто ўжо зрабіў гэта, — пажадаў перамогі.


### ИНФОРМАЦИЯ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **государственного учреждения «Воложинский территориальный центр социального обслуживания населения»** (222 357, г. Воложин, ул. Мира, 8), проводит открытый аукцион по продаже

**автомобиля легкового внедорожника универсала UAZ 3163-305-11 Patriot, 2015 г. в., регистрационный знак 6594 КТ-5, временный регистрационный знак 5НЕТ9861, кузов (VIN) № ХТТ316300F1024990, 316300F0517271, цвет темно-зеленый, находящегося по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Мира, 8.**

**Начальная цена** (без НДС) – **14 300,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 430,00** бел. руб.).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **17.03.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2025** до **17.00. Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**

**Тел. для осмотра транспорта +375 44 578 51 20, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНП 690277577



### ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 10/25 по продаже имущества ЗАО «ОЗТМ»

Аукцион проводится **18.03.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by/ (далее — ЭТП).

**Заявки на участие в аукционе принимаются по 14.03.2025 включительно до 17.00**

Предмет аукциона

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи лота, рублей | Задаток, рублей |
|---|---|---|---|
| 1 | Гранулятор сухого льда IP 120 с пластиной экструдера 3 мм (инвентарный № 40341) | 70 000,00 | 7 000,00 |
| 2 | Аппарат для очистки сухим льдом IB15/80 с аксессуарами (инвентарный № 40342) | 15 000,00 | 1 500,00 |
| 3 | Аппарат для очистки сухим льдом IB15/80 с аксессуарами (инвентарный № 40343) | 15 000,00 | 1 500,00 |
| 4 | Агрегат дробеструйный Blastrac 1-15 DS (инвентарный № 41745) | 25 000,00 | 2 500,00 |
| 5 | Кран козловой ККТ-5 (заводской № 134) | 60 000,00 | 6 000,00 |
| 6 | Станок зиговочный с ручным управлением мод. IK 1.2 (инвентарный № 44778) | 600,00 | 60,00 |
| 7 | Машина шлифовальная Blastrac BMG-580 SC (инвентарный № 41746) | 30 000,00 | 3 000,00 |

Начальные цены лотов включают в себя НДС по ставке 20 %

Для участия в аукционе необходимо:
1. внести задаток на расчетный счет продавца BY94AKBB30121406023617100000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «ОЗТМ», УНП 791053861, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе №10/25 по лоту № ___». Для участия в аукционе по нескольким лотам задаток должен быть перечислен по каждому из них;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП.

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона, устанавливающего права, обязанности и ответственность участника аукциона.

Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона – 5 процентов от начальной цены лота. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику, с его согласия, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) возмещает организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, а также уплачивает вознаграждение в размере **5 процентов** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 30 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 40 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.

Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

Организатор аукциона и оператор ЭТП: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22, realtorgi@expertiza.by, https://www.expertiza.by

Продавец – ЗАО «ОЗТМ», УНП 791053861, г. Осиповичи, ул. Потоцкого, д.10



**Утерянную печать общества с ограниченной ответственностью «САНТЕХПРОМ» (УНП 101304394) считать недействительной**



**Утерянную печать общества с ограниченной ответственностью «ВКР-Инвест» (УНП 691341323) считать недействительной**

# НАДБАЎКІ МЕДСЁСТРАМ І ФЕЛЬЧАРАМ ВЫРАСТУЦЬ НА 35 ПРАЦЭНТАЎ



## ПАВЫШЭННЕ ЗАКРАНЕ 110 ТЫСЯЧ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Як адзначыў **намеснік міністра аховы здароўя Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ**, гэта планавая работа па павышэнні заработнай платы ў галіне аховы здароўя:

— Выйшла пастанова, якая рэгламентуе павышэнне надбавак у людзей, якія працуюць у галіне аховы здароўя і маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю. Гэта медыцынскія сёстры і фельчары. У цэлым надбаўкі павялічацца на 35 %. Гэта будзе адбывацца ў выніку трох планавых павышэнняў заработнай платы і паўплывае на павелічэнне надбавак у розных катэгорый спецыялістаў, якія займаюцца той ці іншай работай у галіне аховы здароўя.

Павышэнне закране больш чым 110 тысяч работнікаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, якія працуюць у нашай краіне ў сферы аховы здароўя.

— Гэта вялікая група спецыялістаў, якія нясуць на сваіх пераважна жаночых плячах сур'ёзную нагрузку, і, зразумела, заработная плата і надбаўкі залежаць ад спецыялізацыі спецыялістаў, — падкрэсліў Аляксандр Старавойтаў. — У сясцёр-анестэзістак аплата адна, фельчароў хуткай дапамогі — другая, спецыялістаў, якія працуюць памочнікамі ўрача, участковымі медыцынскімі сёстрамі, — трэцяя. У залежнасці ад аб'ёму і напружанасці працы адбываецца і дыферэнцыяцыя аплаты.

Як патлумачыў намеснік міністра, гэта дадатковыя надбаўкі да тых, што існавалі раней:

— Першапачатковa яны былі прыняты па рашэнні кіраўніка дзяржавы, каб стымуляваць кваліфікаваных работнікаў для падаўжэння работы ў галіне аховы здароўя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Як бачыце, работа не стаіць на месцы, дзяржава прыкладае ўсе намаганні, каб спецыялісты раслі і развіваліся. Таму гэта павышэнне зарплаты планавае.

## КАМУ КОЛЬКІ?

Надбаўка за спецыфіку работы ў сферы аховы здароўя медыцынскім работнікам з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй устаноўлена ў памеры 30 працэнтаў ад акладу.

Акрамя таго, надбаўка за работу ў сферы аховы здароўя медработнікам з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі, інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі з 1 сакавіка складзе 130 працэнтаў акладу, з 1 верасня — 140 працэнтаў, з 1 снежня — 155 працэнтаў. Работнікам прыёмнага аддзялення і аддзяленняў (палат) для пацыентаў з парушэннем мазгавога кровазвароту (інсультам) з 1 сакавіка надбаўка складзе 110 працэнтаў акладу, з 1 верасня — 120 працэнтаў, з 1 снежня — 135 працэнтаў.

Медыцынскім работнікам з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй выязных брыгад з 1 сакавіка надбаўкі ўстаноўлены ў 120 працэнтаў акладу, з 1 верасня — 130 працэнтаў, з 1 снежня — 145 працэнтаў. Фельчарам выязных брыгад, якія выязджаюць па выкліку самастойна без урачоў, з 1 сакавіка — 170 працэнтаў, з 1 верасня — 180 працэнтаў, з 1 снежня — 195 працэнтаў.

Участковым медыцынскім сёстрам, братам, памочнікам урача па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе тэрытарыяльных участкаў, медыцынскім сёстрам і братам агульнай практыкі, фельчарам, медработнікам з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй фельчарска-акушэрскіх пунктаў, у тым ліку прынятым на пасаду служачага з ужываннем вытворнага найменне «старшы», надбаўка з 1 сакавіка складзе 110 працэнтаў акладу, з 1 верасня — 120 працэнтаў, з 1 снежня — 135 працэнтаў.

Медработнікам з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй, галоўнай медыцынскай сястры, галоўнаму медыцынскаму брату з 1 сакавіка надбаўка ўстаноўлена ў памеры 95 працэнтаў акладу, з 1 верасня — 105 працэнтаў, з 1 снежня — 120 працэнтаў.

Выніковая сума даплат будзе залежаць ад профілю супрацоўніка, што звязана з аб'ёмам і напружанасцю працы.

**Алена КРАВЕЦ.**

### У тэму

**Медыцынская сястра ўчастковая (старшая) 2-га педыятрычнага аддзялення ўстановы аховы здароўя «25-я гарадская дзіцячая паліклініка» Аксана НАРУТА:**

**— Калі стала вядома, што павышаюцца надбаўкі да зарплаты ўрачоў, мы былі крыху засмучаны, бо медыцынская сястра — гэта іх правая рука і галоўны памочнік. А цяпер і нам паведамілі добрую навіну, што надбаўкі ў тры этапы вырастуць і ў сярэдняга медыцынскага персаналу. Гэта вельмі радуе. Адчуваецца, што наша дзяржава клапоціцца пра работнікаў галіны аховы здароўя, і за гэта вялікі дзякуй.**

ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

# ЧАС ВЫЗНАЧАЦЬ СВАЮ БУДУЧЫНЮ

**У сталіцы пройдзе форум «Адукацыя і кар'ера»**

У Міністэрстве адукацыі адзначылі, што актыўная прафарыентацыйная дзейнасць, якая вядзецца сёння ва ўстановах адукацыі краіны, дапамагае школьнікам падысці да ўступнай кампаніі з выразным уяўленнем сябе ў той ці іншай спецыяльнасці, а значыць, з матывавацыяй да навучання. Профільныя — педагагічныя, інжынерныя — класы ў агульнаадукацыйных школах паспяхова выконваюць яшчэ адну важную місію — павышаюць прэстыж прафесіі педагога і інжынера. Вынікі ўступнай кампаніі мінулага года паказалі, што ў моладзі ўзрасла цікавасць да прафесіі педагога.



Такі ж усвядомлены выбар сёння можа зрабіць любы школьнік, нават не навучаючыся ў профільным класе. Для гэтага ў Беларусі шмат магчымасцяў. Адна з іх — наведаць форум «Адукацыя і кар'ера», які пройдзе ў Мінску з 14 да 16 лютага. Выстава праводзіцца ўжо 22 гады, і з году ў год яе папулярнасць расце. У мінулым годзе форум падтрымалі больш за 120 удзельнікаў, з іх — 40 устаноў вышэйшай адукацыі, 44 каледжы і шэраг падведамных арганізацый, арганізацый — заказчыкаў кадраў, гасцямі выставы сталі больш за 12 тысяч чалавек.

— Сёлета заяўку на ўдзел у гэтым маштабным форуме ўжо падалі каля 45 ВНУ і 70 каледжаў Беларусі, — паведаміў **начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Сяргей ПІШЧОЎ**. — У апошнія гады мерапрыемства праводзіцца ў абноўленым фармаце і паслужыць стартам актыўнай фазы ўступнай кампаніі ва ўстановы прафесійнай адукацыі, дазволіць арганізацыям — заказчыкам кадраў правесці дадатковую работу з выпускнікамі ўстаноў агульнай і сярэдняй адукацыі, каледжаў, ВНУ, ажыццявіць падбор маладых спецыялістаў для далейшага працаўладкавання на свае прадпрыемствы.

Удзел у выставе запланавалі 42 арганізацыі — заказчыкі кадраў практычна з усіх міністэрстваў, ведамстваў, вядучых валаўтваральных арганізацый краіны.

— Яны таксама трымаюць руку на пульсе, — канстатуе Сяргей Пішчоў. — Таму што падрыхтоўка будучых спецыялістаў, іх працаўладкаванне, замацаванне на прадпрыемствах — задача, якая павінна вырашацца і вырашаецца ўжо сёння не на студэнцкай лаве, не з выпускнікамі ВНУ і каледжаў, а з выпускнікамі школ. У краіне створана вялікая колькасць магчымасцяў для паступлення ва ўстановы прафесійнай адукацыі.

Менавіта таму ў апошнія гады выставу наведвае ўсё больш студэнтаў, якія становяцца, па сутнасці, яе мэтавай аўдыторыяй. Сярод вялікай колькасці прадпрыемстваў маладыя людзі маюць вялікі шанц знайсці і сваё першае працоўнае месца, і месца для праходжання вытворчай практыкі, наладзіць кантакты для далейшага кар'ернага росту.

На выставе традыцыйна будуць прадстаўлены тры буйныя кірункі. Першы — «Адукацыя», куды ўвойдуць установы вышэйшай адукацыі і каледжы, другі — «Кар'ера», які прадставяць арганізацыі — заказчыкі кадраў, і трэці — «Дадатковая адукацыя і адукацыйныя тэхналогіі», дзе будуць прадстаўлены магчымасці ў арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Увогуле, праграма форуму ўключае больш за 60 мерапрыемстваў, якія будуць праходзіць тры дні ў рэжыме нон-стоп. Па традыцыі ВНУ і каледжы таксама падрыхтуюць свае праграмы.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**






АДКРЫВАЕМ РАДЗІМУ

# ГОРАД, ДЗЕ ЖЫВЕ ГІСТОРЫЯ

## Таямніцы і адкрыцці Мсціслава



Шмат таямніц і загадак захоўваюць у сабе гарады ўсходняй Беларусі. «Звязда» разам з Нацыянальным агенцтвам па турызме адправілася ў Мсціслаў, каб расказаць і паказаць, чым адметныя гэты старажытны горад і яго наваколле.

## РЫЦАРСКАЯ РАМАНТЫКА

Мабыць, першая асацыяцыя, якая ўзнікае з гэтым горадам, — рыцарскі фэст — мерапрыемства, якое пераносіць гасцей і жыхароў горада ў каларытнае сярэднявечча. Уся праграма сканцэнтравана на Замкавай гары, якая з'яўляецца сэрцам Мсціслава і «археалагічнай меккай». Непадалёк размешчаны цікавы помнік, прысвечаны невядомаму рыцару.






— У 2013 годзе на рацэ Віхра былі праведзены падводныя археалагічныя раскопкі пад кіраўніцтвам прафесара, доктара гістарычных навук Ігара Марзалюка сумесна з дайв-клубам «Марскі пегас». У выніку выявілі ўнікальныя даспехі XVI стагоддзя, якія з'явіліся ўпершыню ў Германіі, — расказала **экскурсавод Яраслава АСІПЦОВА.** — Сёння гэтыя даспехі захоўваюцца ў музеі гісторыі горада Магілёва. Усё, што ў нас засталося ад іх і ад тых падводных археалагічных раскопак, — гэта астанкі невядомага маладога рыцара, якія былі ўзняты разам з даспехамі. Ён удзельнічаў у Мсціслаўскай бітве 4—16 лістапада 1502 года. У 2014-м, падчас правядзення «Рыцарскага фэсту», яны былі пахаваны на гэтым месцы як даніна памяці аб гістарычным мінулым горада Мсціслава.

Рухаемся далей і трапляем у гарадзішча, дзе ўзноўлена гістарычная забудова XII—XIV стст. Тут і археалагічны музей з унікальнымі экспанатамі, і старажытны раскоп з рэшткамі кузні, дома, маставой, каналізацыйных збудаванняў. Цэнтрам забудовы стала драўляная абарончая вежа-данжон з этнаграфічнай экспазіцыяй «Дрэва жыцця». А ў сярэднявечча гэты будынак выконваў аднačасова функцыі і царквы, і абарончага збудавання.

— Уся тэрыторыя Замкавай гары была забудавана хаткамі. Асобнага месца для абарончай вежы і царквы проста не было, таму зрабілі такое сумяшчэнне. Акрамя таго, знаходжанне тут царквы было своеасаблівым абярэгам, — адзначыла Яраслава Асіпцова.

З вышыні Замкавай гары адкрываецца цудоўны від на першы каталіцкі храм Мсціслава, які быў узведзены ў 1614 годзе. Сёння касцёл Ушэсця Дзевы Марыі рэстаўрыруюць.

## ЗЯМЛЯ МАЙСТРОЎ

Мсціслаўскі край багаты і на майстроў. Так, падчас прагулкі па горадзе немагчыма не звярнуць увагі на шэсць каменных скульптур, якія з'явіліся яшчэ ў 2016 годзе пасля пленэру скульптараў. Тут і «Стары горад» Уладзіміра Панцялеева, і «Захавальнік гісторыі» Андрэя Вараб'ёва. А яшчэ тут усталявана ажно два помнікі знакамітаму ўраджэнцу — першадрукару Пятру Мсціслаўцу. «Ад удзячных землякоў» — так абвяшчае надпіс на адным з іх.

Прыемным сюрпрызам падчас нашага візіту ў горад стала знаёмства з дзіўным чалавекам: народным майстрам, кавалём Сяргеем Кудзікавым. Ён калісьці выкладаў інфарматыку ў каледжы, аднак у пэўны момант вырашыў кардынальна змяніць сваё жыццё.

— Пачынаў калісьці з гістарычнай рэканструкцыі, рабіў сабе даспехі, каваў мячы... Наогул кавальская справа — гэта ж сукупнасць усіх кірункаў: мастацтва, творчасці, інструментаў, матэрыялаў.

Свае веды і ўменні ён з радасцю перадае падрастаючаму пакаленню.

— Я вяду аматарскае аб'яднанне для старшакласнікаў. Ім падабаецца, наколькі ўсё гэта разнапланава. Напрыклад, фехтаванне — гэта спортпадрыхтоўка. Паездка на фестывалі і знаёмства з рамеснікамі — неацэнны вопыт, які патрэбен для таго, каб у моладзі была вялікая зацікаўленасць да нашай гісторыі і культуры.

## ПРЫГРАНІЧНЫ МАНАСТЫР

Духоўным цэнтрам Мсціслаўскага краю лічыцца Пустынскі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр, заснаваны ў 1380 годзе. Размешчаны ён за 12 кіламетраў ад Мсціслава і ўсяго за 500 метраў ад граніцы з Расіяй. Паводле легенды, аслеплы мсціслаўскі князь Сімяон Альгердавіч убачыў у сне старца, які загадаў яму адшукаць у акрузе крыніцу і прамыць вадой з яе вочы. Усё зрабіў, і, калі вылечыўся, першым, што князь убачыў, была ікона Багародзіцы на дрэве. Так, паводле яго загаду, на тым месцы пабудавалі храм і заснавалі мужчынскі манастыр. Абраз доўгі час захоўваўся тут, аднак у 1920-х гадах быў беззваротна страчаны.

Здалёк відаць шмат'ярусную шатровую званіцу вышынёй амаль 59 метраў. Яе ўзвялі яшчэ ў 1866 годзе разам з царкоўнай школай, гаспадарчай і жылой пабудовай. Ёсць і ўражальныя месцы на тэрыторыі манастыра, аднак з-за складаных гістарычных выпрабаванняў яны ператварыліся ў руіны. Як напрыклад, Успенскі сабор, што ў 1800-х быў велічным збудаваннем з купаламі, аркамі і багатай ляпнінай.

**Удалося нам убачыць і галоўную святыню гэтага месца: нерукатворнае аблічча Ісуса Хрыста, які праявіўся на сцяне старога ігуменскага корпуса.**

— Упершыню гэта здарылася ў 1924 годзе, калі тут быў дзіцячы дом. У часы атэізму з выявай паступілі бязлітасна — высеклі са сцяны і выкінулі за вароты. Другая праява з'явілася ў 2003 годзе, калі манахі аднаўлялі будынак. Падчас рэстаўрацыі пад абразом Багародзіцы, што вісеў на гэтым месцы, раптам заўважылі вобраз, які з кожным днём станавіўся ўсё ярчэйшым, — апраўленае аблічча Збавіцеля. Кропка, у якую калісьці быў убіты цвік для абраза, знаходзілася якраз на лобнай косці, дзе была рана ад цярновага вянка, — распавёў **святар Пустынскага манастыра, іераманах ІЛАРЫЁН.**

Шмат паломнікаў сюды прыцягваюць цудатворныя крыніцы, якіх тут ажно чатыры. У кожнай з іх сваё асаблівае прызначэнне. Так, да самай аддаленай, асвечанай у гонар Ефрасінні Полацкай, едуць, каб вылечыць ногі. Да маленькай крыніцы за трапезнай у гонар Архангела Міхаіла ідуць за суцяшэннем і каб адагнаць засмучэнне. А для малітваў аб дзецях і сям'і адпраўляюцца да крыніцы Веры, Надзеі, Любові і маці іх Сафіі. Самая ж вядомая і старажытная крыніца на тэрыторыі манастыра названа ў гонар Божай Маці: ёй ужо больш за шэсць стагоддзяў.

Мсціслаў абавязкова трэба ўбачыць на свае вочы. Прагуляцца па вулачках, прасякнутых гісторыяй, наведаць музеі, падняцца на Замкавую гару і папіць вады з цудатворнай крыніцы. А можа, нават стаць удзельнікам маштабнага рыцарскага фэсту і захапіцца гістарычнай рэканструкцыяй.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества**

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на 3 года**

| № лота | Наименование недвижимого имущества | Размер арендной платы за месяц, руб. | **Начальная цена / сумма задатка, руб.** |
|---|---|---|---|
| **1** | **Магазин «Рыбная лавка», 125 кв. м** (в инв. № 642/D-8453), Минская обл., г. Копыль, ул. Комсомольская, д. 1А | 1 875,00 | 468,75 |
| 2 | **Второй этаж универмага № 1, 233,3 кв. м.** (в инв. № 642/С-11420), Минская обл., г. Копыль, пл. Ленина, 21 | 2 333,00 | 583,25 |
| 3 | **Первый этаж универмага № 1, 145,6 кв. м** (в инв. № 642/С-11420), Минская обл., г. Копыль, пл. Ленина, 21 | 2 912,00 | 728,00 |
| 4 | **Магазин «Слуцкий край», 88,2 кв. м** (в инв. № 642/С-11416), Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанская, 1Б | 698,40 | 174,60 |
| 5 | **Магазин , 124 кв. м,** Минская обл., Копыльский р-н, д. Чырвоная Дубрава, ул. Красная Горка, 1А | 446,40 | 111,60 |
| 6 | **Магазин, 102 кв. м,** Минская обл., Копыльский р-н, д. Черногубово, ул. Центральная, 100 | 367,20 | 91,80 |

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок оплаты предмета аукциона: 3 (три) рабочих** дня после проведения аукциона

**Срок подписания договора аренды: 10 (десять) рабочих** дней после проведения аукциона

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 2 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 10.12.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 28.03.2025**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **27.02.2025 до 17.00**

**Контактные телефоны: +375 17 310-36-37; +375 29 154-34-35; www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**

извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 25.02.2025**

**Лот № 1:** продовольственный магазин с инв. № 400/D-152911, площадь – 1653,50 кв. м. Адрес: Гродненская обл., г. Гродно, пр-т Космонавтов, 27-81. Земельный участок № 440100000002000751, 0,2169 га. Право постоянного пользования.

Обременения: Аренда, Ипотека.
Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 253 977,20 долл. США.
Задаток – 424 007,31 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

